Источник: "Веды" - 2014-12-22

# «ГІСТОРЫЯ НІКОЛІ НЕ МОЖА БЫЦЬ ЗАВЕРШАНАЙ»

**У Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Я.Коласа НАН Беларусі адбылася прэзентацыя фундаментальнага даследавання літаратурнага працэсу нашай краіны – «Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя» ў 6-ці кнігах. Унікальная, маштабная па сваёй навуковай значнасці праца створана вялікім калектывам аўтараў і рэдактараў на базе філіяла «Інстытут мовы і літаратуры імя Я.Коласа і Я.Купалы» Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі. Кнігі выйшлі ў Выдавецкім доме «Беларуская навука».**





Паводле слоў намесніка дырэктара Інстытута па навуковай рабоце Сяргея Гараніна **(на фота)**, выданне шматтомніка пачалося яшчэ ў сярэдзіне 1990-х гадоў у сувязі з пераглядам ідэалагічных момантаў, якія існавалі раней. У прыватнасці, з атрыманнем Беларуссю незалежнасці змяніўся і статус нацыянальнай літаратуры. Акрамя таго, мінулыя выданні ў многіх адносінах не задавальнялі попыт чытачоў, бо з'явіліся новыя творы, пісьменнікі, даследаванні. Літаратурны працэс пачаў раскрывацца іначай.

З цягам часу літаратуразнаўчыя методыкі ды і сама тэорыя літаратуразнаўства настолькі далёка прайшлі наперад, што гэта пачало вылівацца ў новую гісторыю беларускай літаратуры.

Напачатку рэдактарам і натхняльнікам першых тамоў «Гісторыі...» быў Віктар Каваленка. Кіраваў праектам акадэмік Уладзімір Гніламёдаў. Тры апошнія тамы цалкам рабіў член-карэспандэнт Сцяпан Лаўшук.

«Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя» ў 4-х тамах. Том 4, кніга 3-я завяршае серыю. Аднак, па перакананні С.Гараніна, гісторыя ніколі не можа быць завершанай. Таму наперадзе новыя даследаванні і новыя выданні.

Больш за тое, акадэмічнае выданне «Гісторыі» будзе пакладзена ў аснову дапаможнікаў для ВНУ, падручнікаў для школ. Яно ўяўляе сабой своеасаблівы пантэон пісьменнікаў, з творчасцю якіх варта пазнаёміцца чытачам; дае арыенціры, напрамак для разумення гісторыі і сучаснага літаратурнага працэсу.

Кожная кніга выдання ўключае раздзелы агульнага разгляду: па паэзіі, прозе, драматургіі, крытыцы і літаратуразнаўстве.

У персанальных артыкулах, прысвечаных творчасці вядомых пісьменнікаў, раскрываюцца нацыянальная спецыфіка беларускай літаратуры, яе роля і значэнне ў паглыбленні грамадскай свядомасці, выхаванні патрыятызму і гуманізму, паказаны ўвесь патэнцыял беларускай духоўнай культуры ў галіне мастацкага слова на працягу стагоддзя, яе ідэйна-эстэтычнае багацце і непаўторнасць.

Упершыню ў гісторыю айчыннай літаратуры ўключаны разгляд і аналіз набыткаў беларускіх пісьменнікаў Беласточчыны і літаратараў-эмігрантаў.

Ацэнка знакавых мастацкіх з'яў, складанай повязі пісьменніка з часам і грамадскай атмасферай грунтуецца на прынцыпах гістарызму, праводзіцца з улікам новых навуковых падыходаў, у адпаведнасці з сучаснымі гуманістычнымі, дэмакратычнымі патрабаваннямі.

У кожным томе змешчаны раздзелы багатай на факты і падзеі хронікі літаратурнага жыцця.

Акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук А.Каваленя выказаў перакананне, што «Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя» – помнік не толькі ўсім тым, хто працаваў і ствараў літаратурную спадчыну Беларусі, але і тым, хто рабіў высакародную справу – падрыхтаваў да друку гэта выданне. «Пад кіраўніцтвам Сцяпана Лаўшука зрабілі самую высакародную справу і спыняцца нам на гэтым не трэба. Сёння ў нас шмат маладых аўтараў, якіх таксама неабходна ўводзіць у навукова-творчае жыццё», – сказаў у сваім выступленні А.Каваленя.

У мерапрыемстве ўзялі таксама ўдзел А.Лакотка, Н.Камарова, С.Лаўшук, П.Васючэнка, Ул.Ліпскі, Г.Кісялёў, І.Шаўлякова-Барзенка, І.Гоўзіч, Л.Дранько-Майсюк, М.Міцкевіч, А.Рагуля, М.Мушынскі, П.Лысенка і інш.

У рамках імпрэзы адбылося адкрыццё выставы «Літаратурная спадчына XX стагоддзя», падрыхтаванай супрацоўнікамі ЦНБ НАН Беларусі. Тут дэманстраваліся дапаможнікі па беларускай літаратуры, калектыўныя і аўтарскія манаграфіі, у якіх разглядаецца гісторыя айчыннага пісьменства XX стагоддзя, падводзяцца асноўныя вынікі развіцця нацыянальнага літаратурнага працэсу, раскрываецца маральна-эстэтычны і духоўны патэнцыял мастацкіх твораў.

**Святлана КАНАНОВІЧ**
**Фота аўтара, «Веды»**

Святлана Кананович. "Гісторыя ніколі не можа быць завершанай"